Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 274 (343)
ЧАЦВЕР
28
ЛІСТАПАДА
1940 г.

Цана 10 капеек.

ЦК ВКП(б) таварышу СТАЛІНУ І. В. СНК СССР таварышу МОЛАТАВУ В. М.

25 лістапада 1940 года ва ўсіх абласцях, краях і рэспубліках закончан прызыў гарадской і калгаснай моладзі ў Рамесленыя, Чыгуначныя Вучылішчы і ў школы Фабрычна-Заводскага Абучэння. Па паведамленнях гарадскіх, абласных, краявых і рэспубліканскіх Упраўленняў Працоўных Рэзерваў ўсяго ў Рамесленыя, Чыгуначныя Вучылішчы і ў школы Фабрычна-Заводскага Абучэння прызвана 601.378 чалавек, у тым ліку ў Рамесленыя Вучылішчы—307.962 чалавекі, у Чыгуначныя Вучылішчы — 36.589 чалавек і ў школы Фабрычна-Заводскага Абучэння — 256.827 чалавек.

Прызыў суправаджаўся велізарным імкненнем гарадской і калгаснай моладзі паступіць у Рамесленыя, Чыгуначныя Вучылішчы і ў школы Фабрычна-Заводскага Абучэння. У прызыўныя камісіі ў перыяд прызыву было падана 1.100 тысяч заяў ад моладзі з просьбай аб прыёме ў Рамесленыя, Чыгуначныя Вучылішчы і ў школы ФЗА.

Начальнік Галоўнага Упраўлення Працоўных Рэзерваў пры СНК СССР
П. МАСКАТАЎ.

ШЫРЭЙ РАЗМАХ ПЕРАДВЫБАРЧАЙ АГІТАЦЫІ НА ВЁСЦЫ!

Ва ўсіх раёнах нашай вобласці закончылася вылучэнне і рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты сельскіх Советаў. Перадвыбарчыя сходы ў вёсках праходзяць пры вялікай актыўнасці працоўных сялян. У яркіх, палкіх прамовах калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі выказваюць вялікую любоў да комуністычнай партыі, да сваёй любімай радзімы—Совецкага Саюза, да вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна, дзякуюць совецкі народ за вызваленне, за шчаслівае і радаснае жыццё.

Селянін тав. Цімолка на сходзе ў вёсцы Клімавічы, Старадубскага сельсовета, Гродненскага раёна, заявіў:

«Дзякуй таварышу Сталіну, што ён даў нам права быць гаспадарамі сваёй краіны і кіраваць нашай дзяржавай. Вылучаць і галасаваць мы будзем за дастойных кандыдатаў у дэпутаты нашых Советаў».

На сходзе ў вёсцы Ласічы, Сядаўскага раёна, селянін-бядняк Канавалец сказаў: «...пры царызме і пры былым панскім урадзе Польшчы і працоўныя палякі былі бяспраўныя. Я раней ніколі не меў зямлі і нават не меў сваёй хаты, а цяпер, пры совецкай уладзе, хату займеў, атрымаў зямлю...»

Партыя большэвікоў, совецкая ўлада разняволіла працоўных сялян, дала ім магчымасць свабодна працаваць і поўнасцю скарыстоўваць плады сваёй працы. Тысячы сялянскіх гаспадарак у нашай вобласці ўжо аб'ядналіся ў калгасы, навекі парвалі з прымітыўнай аднаасобнай гаспадаркай. За год сваёй дзейнасці маладыя калгасы дабіліся выключна вялікіх поспехаў. Сяляне, якія ўступілі ў калгасы, на ўласным вопыце пераканаліся, што толькі ў калгасе яны даб'юцца заможнага і культурнага жыцця.

Працоўныя сяляне вылучылі кандыдатамі ў дэпутаты сельскіх Советаў самых лепшых, самых чэсных прадстаўнікоў вёскі. У Харашчанскі сельсовет (Беластоцкі раён) вылучан і зарэгістрыраван селянін-бядняк Аляксандр Ануфрыевіч Зайкоўскі, актыўны грамадскі працаўнік сяла. У Граеўскім раёне кандыдатам у дэпутаты Нечкаўскага сельсовета вылучана трактарыстка МТС Марыя Садоўская. Калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імені 17 верасня, Аўгустоўскага раёна, кандыдатам у дэпутаты сельскага Совета вылучылі ўдарніцу калгаса Яніну Адамаўну Град, былую батрачку.

Выбарчая кампанія ў вёсцы праходзіць ва ўмовах жорсткай класавай барацьбы. Кулакі і іншыя варожыя элементы імкнуцца процістаўляць кандыдатам народа сваіх людзей, імкнуцца шляхам паклёпу і пагроз запалохаць асобных выбаршчыкаў і кандыдатаў у дэпутаты.

У вёсцы Будзішаўка, Мянаўскага сельсовета, Чыжаўскага раёна, сяляне, беднякі і серадняки на сходзе прапанавалі вылучыць кандыдатам у дэпутаты сельскага Совета батрака Івана Банчук. Кулакі выступілі супроць гэтай кандыдатуры. За два дні да схода яны дагаварыліся выставіць кандыдатам у дэпутаты сельскага Совета свайго чалавека, былога войта. У вёсцы Чыжава-Рус кандыдатам у дэпутаты сельскага Совета сяляне вылучылі актывістку сяла Уладзіславу Курак. Кулакі-ж, не жадаючы, каб яна была дэпутатам сельскага Совета, падгаварылі яе мужа, каб той прымусіў тав. Курак не даць згоды балатыравацца кандыдатам у дэпутаты. Калі-ж Уладзіслава Курак не паслухала мужа і дала згоду балатыравацца кандыдатам у дэпутаты сельскага Совета, то муж збіў яе.

Працоўныя сяляне вёскі: батракі, беднякі і серадняки даюць жорсткі адпор кулакам і іх падпявалам і вылучаюць кандыдатамі ў дэпутаты сапраўды чэсных і дастойных людзей, якія да канца адданы вялікай справе Леніна—Сталіна, чэсна служаць народу.

Партыйныя арганізацыі раёнаў разгарнулі шырокую агітацыйна-масавую работу ў вёсках. Да вядзення агітацыі сярод сялян прыцягнуты тысячы агітатараў. Пераважная большасць агітатараў па-большэвіцку арганізавалі работу. Сялянка-агітатар тав. Санеўская ў Стара-Закшэўскім сельсовеце, Замбраўскага раёна, вывучыла з сялянамі Палажэнне аб выбарах і праводзіць гутаркі аб кандыдатах у дэпутаты. Сяляне вельмі цікавяцца яе гутаркамі. На першых занятках у яе прысутнічала 15 чалавек, а на паследуючыя прыходзяць па 25—30 чалавек. Змястоўна і цікава праходзяць заняткі ў гуртках сялян-выбаршчыкаў у Калакскім сельсовеце, якімі кіруюць настаўнікі Шульборскі і Шумскі.

Але ў асобных месцах агітацыйна-масавая работа сярод выбаршчыкаў разгорнута недастаткова. У Крынкаўскім і Саколкаўскім раёнах не ўсе выбаршчыкі ахоплены вывучэннем Палажэння аб выбарах і Канстытуцыі. У некаторых вёсках асобныя сяляне не ведаюць сваіх кандыдатаў у дэпутаты раённага і абласнога Советаў.

Да 15 снежня— дня выбараў— астаецца мала часу. Як ніколі цяпер неабходна разгарнуць агітацыю за кандыдатаў у дэпутаты. Большэвіцкай агітацыяй трэба ахапіць кожнага выбаршчыка. Ні ў якім разе нельга пакідаць па-за ўвагай сялян, якія пражываюць на хутарах. Сярод іх агітацыйную работу неабходна асабліва ўзмацніць. Калі няма магчымасці сялян, пражываючых на хутарах, аб'яднаць у гурткі, то неабходна да кожнага хутара прымацаваць агітатара для правядзення індывідуальных гутарак.

Шырэй і глыбей трэба разгарнуць агітацыю сярод сялянак, прыцягнуць іх да актыўнага ўдзелу ў выбарчай кампаніі. Жанчыны ў капіталістычнай Польшчы былі асабліва забіты і прыніжаны. Толькі совецкая ўлада дала ім сапраўды роўныя правы. Неабходна сялянкам проста і зразумела расказаць аб нашай краіне, аб Сталінскай Канстытуцыі, аб выдатных героях-жанчынах нашай радзімы. Правільна зрабілі ў Заблудаўскім і іншых раёнах, дзе правялі па вёсках сходы жанчын па пытанню іх удзелу ў выбарчай кампаніі.

Вялікае значэнне мае агітацыя сярод старых. Старыя людзі на сваіх уласных спінах перанеслі цяжкі гнёт рускага царызма і польскіх паноў. Яны жыва цікавяцца новым соцыялістычным жыццём. З імі неабходна правесці спецыяльныя гутаркі, расказаць ім аб вялікіх клопатах совецкай улады аб прастарэлых людзях.

Дзейсная большэвіцкая агітацыя з'яўляецца залогам поспехаў выбарчай кампаніі. Ведучы самую бязлітасную барацьбу з кулацтвам, калгаснікі і працоўныя сяляне вёскі на выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных яшчэ раз прадэманстрыруюць сваю любоў і адданасць да совецкай радзімы, да вялікага Сталіна, усе як адзін аддадуць свае галасы за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

Ушанаванне памяці Адама Міцкевіча

Урачыстае пасяджэнне ў Калонным зале Дома саюзаў.

26 лістапада ў 85-ю гадавіну з дня смерці вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча ў Калонным зале Дома саюзаў адбылося ўрачыстае пасяджэнне, скліканае прэзідыумам Саюза совецкіх пісьменнікаў СССР. Сярод сабраўшыхся — пісьменнікі, вучоныя, артысты, байцы і камандзіры Чырвонай Арміі, прадстаўнікі фабрык і заводаў, студэнцкая моладзь Масквы.

У прэзідыуме —рускія, польскія, украінскія, беларускія і азербайджанскія пісьменнікі: А. Фадзееў, Ванда Васілеўская, Мікола Бажан, Самед Бургун, Янка Купала, П. Паўленка, А. Твардоўскі, В. Вішнеўскі, В. Катаеў, В. Верасаеў, Ф. Панфёраў і іншыя.

Вечар адкрыў уступным словам сакратар прэзідыума Саюза совецкіх пісьменнікаў СССР тав. А. Фадзееў.

Даклад аб жыцці і творчасці Міцкевіча зрабіла тав. Е. Усіевіч.

Затым выступіў народны паэт Беларусі Янка Купала.

У мастацкай частцы вечара прынялі ўдзел вядомыя майстры мастацтва сталіцы. Былі выканаваны творы Міцкевіча і творы, напісаныя на тэксты паэта. (ТАСС).

ПРЫЗЫЎ МОЛАДЗІ Ў ВУЧЫЛІШЧЫ І ШКОЛЫ

ГАТОВЫ ДА ПРЫЁМУ ВУЧНЯЎ

1 снежня пачынаюцца заняткі ў рамесленых, чыгуначных вучылішчах і школах ФЗА. Для сотняў жыццерадасных юнакоў гасцінна адчыняцца дзверы прасторных класаў.

Вось памяшканне Гродненскага рамесленага вучылішча. Яшчэ нядаўна тут была школа фабрычна-заводскага вучнёўства металістаў. Зараз тут размешчаны чатыры цэхі — сталярны, механічны, слесарны і кавальскі. У сталярным цэху ёсць у дастатковай колькасці варштатаў, рубанкаў, стамесак і т. д. Механічны цэх абсталяван фрэзерным, стругальным станкамі, шэлінгамі. З Гомеля для гэтага цэха прыбудзе яшчэ 6 новых такарных станкоў. Слясарны і кавальскі цэхі забяспечаны неабходнымі інструментамі.

У памяшканні школы ФЗВ швейнікаў зроблена 6 вялікіх светлых класаў. Гэта вучэбны корпус вучылішча. Тут ёсць наглядныя дапаможнікі, лік якіх штодзённа папаўняецца. Асабліва багата абсталяван фізічны кабінет. У ім можна рабіць разнастайныя цікавыя вопыты па фізіцы, хіміі і электрычнасці. У адной з аўдыторый размешчан чырвоны куток і бібліятэка. У вольны ад работы час тут вучні змогуць культурна і весела адпачываць. Школа ўкамплектавана высокакваліфікаванымі выкладчыкамі, інструктарамі па металу, дрэву, слясарнай і кавальскай справе.

Праўда, не ўсё яшчэ ў парадку з інтэрнатам. Няма яшчэ матрацаў. Тры пакоі, вызначаныя пад інтэрнат для вучняў, займае дырэктар педвучылішча. Трэба спадзявацца, што дырэкцыя вучылішча пры дапамозе партыйнай і комсамольскай арганізацый неадкладна ліквідуе маючыяся недахопы.

Г. Лупсякоў.

—о—

У Беларусі закончыўся прызыў моладзі ў вучылішчы і школы

25 лістапада па рэспубліцы закончыўся прызыў моладзі ў рамесленыя вучылішчы і школы ФЗА. Усяго прызвана 30.160 чалавек, у тым ліку 26.613 добраахвотнікаў. Калгаснай моладзі адабрана 23.160 чалавек, гарадской — 7.000 чалавек.

У рамесленыя вучылішчы прынята 10.675 юнакоў, у чыгуначныя— 1.985 і школы ФЗА — 17.500.

Першымі закончылі прызыў Гомельская і Палеская вобласці.

Сустрэча выбаршчыкаў з кандыдатамі ў дэпутаты

24 лістапада ў актавым зале Беластоцкага педагагічнага інстытута адбылася сустрэча выбаршчыкаў 2-га Седоўскага выбарчага ўчастка—Цэнтральнай выбарчай акругі са сваімі кандыдатамі ў дэпутаты абласнога і гарадскога Советаў дэпутатаў працоўных. Прысутнічаў кандыдат у дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета, стаханавец-двухстаночнік 6-га тэкстыльнага камбіната Ізраіль Хацкелевіч Курыльскі, кандыдаты ў дэпутаты гарадскога Совета: дырэктар педагагічнага інстытута тав. Краўчанка, сакратар Беластоцкага абкома КП(б)Б тав. Сямёнаў, загадчык гандлёвым аддзелам горвыканкома тав. Шпілёў, студэнтка педагагічнага інстытута тав. Налівайка.

З прамовамі выступілі кандыдаты ў дэпутаты тт. Курыльскі, Сямёнаў, Краўчанка, Налівайка, Шпілёў. Яны расказалі выбаршчыкам свае аўтабіяграфіі і заверылі іх што будуць чэсна служыць народу. Ад выбаршчыкаў з прамовай выступіў даверан па 119-й выбарчай акрузе па выбарах у гарадскі Совет тав. Літвін.

З прамовы кандыдата ў дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета тав. КУРЫЛЬСКАГА

Маё юнацтва прайшло ў цяжкіх умовах. Бацька памёр, калі мне было 12 год. Пасля смерці бацькі я вымушан быў самастойна здабываць сабе кавалак хлеба. Падросткам паступіў на фабрыку Махая, на якой працаваў у вельмі цяжкіх умовах. Фабрыкант здзекваўся над рабочымі. Фабрыка 6 месяцаў у годзе не працавала, і ў гэты перыяд я быў беспрацоўным.

Становішча змянілася з прыходам Чырвонай Арміі. У сапраўднай бацькаўшчыне — СССР усе рабочыя маюць права на працу. У нас высока цэняць працу і тых людзей, хто чэсна працуе. Мне, напрыклад, рабочыя 6-га тэкстыльнага камбіната за чэсныя адносіны да працы аказалі вялікае давер'е, вылучыўшы мяне кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета. Я запэўняю выбаршчыкаў, што апраўдаю аказанае мне давер'е.

З прамовы кандыдата ў дэпутаты Беластоцкага гарадскога Совета па 119-й выбарчай акрузе тав. НАЛІВАЙКА

Я — дачка рабочага. Бацька мой працаваў на чыгунцы. Аднак доўга там працаваць не давялося, бо польскія ўлады звольнілі яго з чыгункі за тое, што ён беларус. Жыццё наша было выключна цяжкім і безнадзейным. Пры панаванні польскіх паноў і капіталістаў вучыцца я не магла. Праўда, у 1937 годзе пры матэрыяльнай дапамозе братоў і сясцёр я рашыла паступіць на вучобу ў гімназію. Аднак мяне не прынялі ў першыя класы, бо я была пераросткам. Тады я рашыла займацца самаадукацыяй. За кароткі тэрмін я паспела вывучыць матэрыялы за тры класы гімназіі і потым была прынята на вучобу ў чацверты клас.

Калі прыйшла совецкая ўлада я вучылася ў 2-м класе польскага ліцэя ў г. Баранавічах. Потым я паступіла займацца ў Беластоцкі педінстытут. Я дзякую студэнтаў і весь калектыў выкладчыкаў і работнікаў педінстытута, якія аказалі мне давер'е, вылучыўшы кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета. Я запэўняю вас, таварышы выбаршчыкі, што з усёй энергіяй буду змагацца за вялікую справу Леніна—Сталіна.

Рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты сельскіх Советаў

ЗАБЛУДАЎ. **(Па тэлефону).** У раёне заканчваецца рэгістрацыя кандыдатаў у сельскія Советы дэпутатаў працоўных.

Па Валілаўскай выбарчай акрузе № 2 па выбарах у сельскі Совет зарэгістрыраван кандыдатам у дэпутаты Валілаўскага сельскага Совета Аляксандр Андрэевіч Ціханоўскі, 1905 г. нараджэння, беларус, беспартыйны, працуе старшынёй калгаса «Вызваленне».

Па Валілаўскай выбарчай акрузе № 4 зарэгістрыраван вылучаны сялянамі вёскі Дзернікова кандыдатам у дэпутаты сельскага Совета Юльян Аляксеевіч Карповіч, 1896 года нараджэння, беспартыйны, беларус, з сялян-беднякоў вёскі Дзернікова.

Акругова Мілешкоўская камісія Мілешкоўскай выбарчай акругі № 18 зарэгістрыравала вылучаную сялянамі вёскі Мілешкі кандыдатам у дэпутаты сельскага Совета Ольгу Аляксееўну Чэмель, 1909 года нараджэння, беларуску, з сялян, хатнюю гаспадыню, актыўную ўдзельніцу грамадскага жыцця сельсовета.

Па Канюкоўскай выбарчай акрузе № 21 зарэгістрыравана кандыдатам у дэпутаты Рыбалоўскага сельскага Совета Фаціна Іванаўна Наумюк, 1907 года нараджэння, беларуска, настаўніца Рыбалоўскай няпоўнай сярэдняй школы.

Рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты Беластоцкага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных

81. Па акрузе **№ 4** зарэгістрыраван Лейб Беркавіч **Грабоўскі,** 1920 года нараджэння, член ВЛКСМ, токар-фрэзероўшчык, вылучаны калектывам рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых Беластоцкага механічнага завода № 35.

82. Па акрузе **№ 8** зарэгістрыраван Уладзіслаў Людвікавіч **Пісарэвіч,** 1905 года нараджэння, беспартыйны, памочнік начальніка ткацкага цэха 3-га тэкстыльнага камбіната, вылучаны калектывам камбіната.

83. Па акрузе **№ 9** зарэгістрыраван Ян Францавіч **Яновіч,** 1878 года нараджэння, беспартыйны, шараўшчык скурзавода № 1, вылучаны калектывам рабочых і служачых 1-га скурзавода.

84. Па акрузе **№ 16** зарэгістрыраван Абрам Лазаравіч **Шчурык,** 1912 года нараджэння, беспартыйны, майстар металаапрацоўчага завода Горпромкамбіната, вылучаны калектывам рабочых і служачых гэтага-ж завода.

85. Па акрузе **№ 19** зарэгістрыраван Ізраіль Майсеевіч **Фрэйдановіч,** 1919 года нараджэння, беспартыйны, ткач 20-й тэкстыльнай фабрыкі, вылучаны калектывам рабочых і служачых сваёй фабрыкі.

86. Па акрузе **№ 27** зарэгістрыравана Стэфанія Юльянаўна **Сакалоўская,** 1908 года нараджэння, беспартыйная, вінтаўшчыца апаратна-прадзільнага цэха 5-га камбіната вылучаная калектывам рабочых і служачых 5-га тэкстыльнага камбіната.

87. Па акрузе **№ 28** зарэгістрыраван Уладзімір Грыгор'евіч **Гарохаў,** 1911 года нараджэння, беспартыйны, загадчык механічнай майстэрні фанернага завода № 7, вылучаны калектывам 7-га завода.

88. Па акрузе **№ 32** зарэгістрыравана Ядвіга Фёдараўна **Зубрыцкая,** 1909 года нараджэння, беспартыйная, сакрэтчыца апаратна-прадзільнага цэха 5-га тэкстыльнага камбіната, вылучаная калектывам гэтага-ж камбіната.

89. Па акрузе **№ 33** зарэгістрыраван Антон Іванавіч **Рашко,** 1911 года нараджэння, беспартыйны, майстар ліцейнага цэха завода мельнічнага абсталявання, вылучаны калектывам рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых гэтага-ж завода.

90. Па акрузе **№ 36** зарэгістрыраван Георгій Якаўлевіч **Янчук,** 1908 года нараджэння, член ВКП(б), дырэктар 2-га тэкстыльнага камбіната, вылучаны калектывам камбіната № 2.

Па Совецкай краіне


150 ТЫСЯЧ КІЛОМЕТРАЎ БЕЗ РАМОНТУ НА АЎТАМАБІЛІ «М-І»

Нядаўна закончылі прабег шоферы аўтабазы ўпраўлення рабоча-сялянскай міліцыі А. Фінагенаў і А. Буздалін. У лістападзе 1938 года яны ўзялі абавязацельства зрабіць на сваёй легкавой машыне «М-1» 100 тысяч кілометраў без капітальнага і сярэдняга рамонту. Стаханаўцы перакрылі свае абавязацельствы: спідаметр іх машыны праз 2 годы паказаў 150.118 кілометраў. З'эканомлена больш тоны гаручага і каля 10 тысяч рублёў (на рамонтах і запасных частках).

ПАЛЯВАННЕ НА ПУШНОГА ЗВЕРА

ІРКУЦК. Зімні сезон палявання на пушного звера ў поўным разгары. У тайгу на промысел выйшла больш 10 тысяч паляўнічых Іркуцкай вобласці. За першы месяц палявання забіта сотні тысяч белак і андатраў.

Больш паспяхова, чым у мінулым годзе, ідзе паляванне на гарнастая і зайца-беляка.



Дзяржаўны герб Літоўскай ССР. Дзяржаўны герб Латвійскай ССР. Дзяржаўны герб Эстонскай ССР.

ЛАБАРАТОРЫЯ ШТУЧНАГА СОНЦА

На пляцоўцы Інстытута фізіялогіі раслін імені К. А. Тіміразева Акадэміі навук СССР пачата будаўніцтва першай у Совецкім Саюзе эксперыментальнай кліматалагічнай лабараторыі. Пры дапамозе спецыяльна абсталяваных камер, складанейшых машын і прыстасаванняў вучоныя створаць штучнае сонца, мароз, сухавеі, даследуюць развіццё раслін пры розных метэаралагічных умовах.

Да гэтага часу біёлагі, вывучаючы ўплыў холаду на азімыя пасевы, стваралі штучна тэмпературу не ніжэй 20 градусаў па Цэльсію. Зараз зроблена магутная халадзільная ўстаноўка, якая вытварае мароз да 60 градусаў.

Абсталёўваецца светавая камера. Магутныя пражэктары робяць сонечнае святло, электрычныя награвальнікі дадуць магчымасць выклікаць любую тэмпературу. Тут можна будзе ствараць клімат розных раёнаў краіны.

Усё абсталяванне і прыборы вырабляюцца на совецкіх заводах.

Лабараторыя ўступіць у строй у будучым годзе.

СЯЛЯНЕ ЛАТВІІ ЎКЛЮЧАЮЦЦА Ў ВЫБАРЧУЮ КАМПАНІЮ

РЫГА. Працоўнае сялянства Совецкай Латвіі ўключаецца ў выбарчую кампанію. Сход актыва сялян Ранкаўскай воласці, Цэскага павета, звярнуўся з пісьмом да ўсіх працоўных сялян і сялянскай інтэлігенцыі Совецкай Латвіі.

Заклікаючы азнаменаваць выбарчую кампанію вытворчымі перамогамі на палях, актыў Ранкаўскай воласці выклікаў на соцыялістычнае спаборніцтва сялян двух суседніх валасцей гэтага-ж павета.

МАСТАЦКІ МУЗЕЙ У ТАРТУ

ТАЛІН. У Тарту адкрыўся мастацкі музей. У ім сабрана 120 карцін, скульптур, рысункаў. Сярод іх—работы вядомых эстонскіх мастакоў К. Мягі, І. Коорт і іншых.

Каштоўны падарунак новаму музею зрабіла вышэйшая мастацкая школа імені К. Мягі, якая перадала яму 33 экспанаты.

КАНДЫДАТЫ Ў ДЭПУТАТЫ АБЛАСНОГА СОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Выбаршчыкі Трасцянскай выбарчай акругі № 66, Кнышынскага раёна! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Нікалая Іванавіча ВАЛЬКОВА!

★ ★ ★

Нікалай Іванавіч Валькоў

(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)

Цяжка і бязрадасна праходзілі дзіцячыя годы ў Нікалая Іванавіча. Яго бацька, які меў толькі тры чвэрці гектара зямлі, каля 40 год працаваў на памешчыкаў і капіталістаў. А ў сям'і было 5 душ...

У 1904 годзе 11-гадовы Коля пасля скончэння сельскай пачатковай школы быў вымушан следаваць па шляху свайго бацькі—ісці ў батракі.

— Аб маіх дзіцячых годах лепш бы не ўспамінаць,—расказвае Нікалай Іванавіч. Гэта было не жыццё, а сапраўдная катарга. Днём апрацоўваеш зямлю, ноччу пасеш кулацкіх коней. І за ўсё гэта атрымоўваў у дзень па... тры з паловай капейкі.

У 1912 годзе Нікалай рашыў расстацца са сваімі гаспадарамі і пайсці ў пошукі лепшага жыцця, лепшай работы. Ён пакідае сваё сяло і накіроўваецца ў Данбас. Трапляе ў мястэчка Юзава (цяпер горад Сталіна). Паступіў на завод, дзе пачаў працаваць спачатку на коксавых печах, потым—на доменных у якасці ваганетчыка.

Юнацкія годы Нікалая праходзілі як і дзіцячыя—бязрадасна, беспрасветна.

У кастрычніку 1914 года яго прызвалі ў царскую армію. У Чорнаморскім флоце ён праслужыў аж да мая 1918 года. Тут яго застала і Кастрычніцкая рэвалюцыя. Некаторы час ён служыў ужо ў Чорнаморскім чырвоным флоце. Будучы матросам, тав. Валькоў удзельнічаў у дэманстрацыі працоўных горада Нікалаева, працаваў у судкоме, заклікаў матросаў да рашучай барацьбы з афіцэр'ём і жандармерыяй.

Толькі з устанаўленнем совецкай улады пачалося ў Нікалая Іванавіча сапраўднае жыццё. Радасным і бадзёрым ён звяртаецца пасля дэмабілізацыі з арміі ў сваё роднае сяло Руска-Парэчнае, Суджанскага раёна, Курскай вобласці, дзе ён нарадзіўся ў 1893 годзе. Яго выбіраюць старшынёй сельсовета. Нікалай Іванавіч разам з астатнімі актывістамі сяла размяркоўвае адабраную ў кулакоў зямлю паміж батракамі і сялянамі — беднякамі



і серадняками. Арганізуецца камітэт беднаты. Тут-жа ў 1918 годзе ён уступае ў рады комуністычнай партыі большэвікоў.

Як здольны работнік тав. Валькоў у ліпені 1919 года выбіраецца членам Суджанската павятовага выканаўчага камітэта і назначаецца загадчыкам аддзела ўпраўлення.

Праз некаторы час тав. Валькоў паступае ў Курскую комуністычную роту. Некалькі месяцаў з'яўляецца чырвонаармейцам, потым яго вылучаюць на пасаду ваеннага камісара спачатку батальёна, а затым брыгады. Пад Абаянню ён вядзе бой супроць банд Дзенікіна.

У баявой абстаноўцы тав. Валькоў знаходзіцца да красавіка 1921 года. У барацьбе супроць розных банд удзельнічае на Дану, на Кубані. У Крыму ён выступае супроць Врангеля, на Каўказе праводзіць вялікую работу па ліквідацыі рэшткаў врангелеўшчыны.

Нямала баявых эпізодаў захавалася ў памяці Нікалая Іванавіча! Пад ураганным агнём англійскай артылерыі вызвалялі Новарасійск. Не гледзячы на стомленасць і недахоп сіл горад быў узят хутка і пры невялікіх стратах.

— Наступленне нашага палка было такім моцным і арганізаваным, — гаворыць тав. Валькоў, — што ворагі нават не паспелі ўцячы. Ля берагоў мора мы жывымі ўзялі і саміх генералаў.

Чырвонаармейцы, якіх абучаў, якімі кіраваў камісар тав. Валькоў, геразім паказалі і на іншых франтах — пры фарсіраванні Сіваша, пры ліквідацыі рэшткаў банд горскага кулацтва.

З паловы 1921 года тав. Н. І. Валькоў працуе ў радзе ваенных камісарыятаў у якасці камісара. Да 1923 года ён — ваенны камісар Суджанскага павета. Далей тры годы на гэтай-жа пасадзе знаходзіцца ў Льгове. 1925 — 1929 годы — у Н-скай стралковай дывізіі кіруе палітычнай і партыйнай работай. З канца 1929 года працуе камісарам у горадзе Горкім, затым у Кашыне і Полацку, у Ельнаўскім раёне, Смаленскай вобласці. У кастрычніку 1939 года Нікалай Іванавіч па накіраванню партыі прыехаў у Беласток, дзе працуе ў якасці абласнога ваеннага камісара.

Працоўныя Кнышынскага раёна аднадушна вылучылі тав. Валькова кандыдатам у дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета па Трасцянскай выбарчай акрузе № 66. Яны ўпэўнены, што Нікалай Іванавіч Валькоў з чэсцю апраўдае давер'е сваіх выбаршчыкаў, як апраўдваў яго на ўсіх участках, куды яго пасылала партыя.

В. Дзям'янаў.

Выбаршчыкі Рыбалоўскай выбарчай акругі № 55, Заблудаўскага раёна! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Ольгу Максімаўну СЕМЕНЮК!

★ ★ ★

Ольга Максімаўна Семенюк

(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)

Беларуская вёска Трасцяніцы, Заблудаўскага раёна, налічвае 240 двароў. Большасць сялян былі тут малазямельнымі. Цяжкае жыццё штурхала іх у кабалу да памешчыкаў і асаднікаў, якія ў цісках трымалі вёску. Шчасце не ўсміхалася і для трасцянскага селяніна Максіма Семенюка. Жыццё і здароўе сваё ён прадаваў эксплаататарам.

Дачка Ольга, якая нарадзілася ў 1902 г., ела хлеб, прапітаны слязамі сваіх бацькоў. Дзяўчынка з вялікімі цяжкасцямі скончыла двухкласную школу. Далей вучыцца нельга было. Рана памёр бацька. Выбухнула вайна 1914 года. Жыццё стала невыносна цяжкім. Быў блізка фронт... Уся вёска ад'язджала ў далёкі тыл—у Тамбоўскую губерню. Затым Оля пераязджае ў Разанскую губерню і паступае нянькай у княжаскі дом. Дзяўчынку гаспадары ўвозяць у Маскву, дзе яна ў іх працуе служанкай.

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэвалюцыя адкрыла светлы шлях для 15-гадовай дзяўчыны. Учарашняя прыбіральшчыца становіцца касірам у совецкім магазіне, а потым—канторшчыцай Мостранса.

Маці ўгаварвае Ольгу вярнуцца ў сваю родную старонку. — Цяпер і зямелькай пажывіцца можна будзе,—гаварыла маці.

Ольга паслухала маці, і яны накіроўваюцца ў свае Трасцяніцы. Але-ж ад вёскі нічога не асталося: яна была спалена дашчэнту. Выпадкова ўцалела хата Семенюка, якая стаяла ў баку ад вёскі. Не было каня, каровы. Не было тут совецкай улады, якая-б клапацілася аб бедняку. У роднай старонцы панавала лютая ўлада памешчыка і паліцэйскага.

У 1922 годзе Ольга выходзіць замуж за вясковага пастуха, які меў адзін з чвэрцю гектара зямлі. На гэтай маленькай гаспадарцы нельга было жыць, і Ольга працавала падзённа ў багацеяў.

Муж Ольгі—Дзімітрый быў па спецыяльнасці настаўнікам, але ён вымушан быў працаваць пастухом. Дзеці падраслі, яны пайшлі працаваць да памешчыка. Яшчэ адну крыўду затаіла глыбока ў сваім сэрцы Ольга Семенюк. А колькі было ў жыцці такіх крыўд, не злічыш, не ўспомніш! Паліцэйская і



іншая сволач у штатскім ведалі, што Ольга Семенюк з'яўляецца іх вялікім недругам. Таму хата вясковага пастуха была на асобным учоце ў пастарунку.

Зусім не дзіўна, што з прыходам Чырвонай Арміі змучаная трасцяніцкая бяднячка Ольга Семенюк аддае на будаўніцтва новага жыцця ўсю сваю нястомную энергію і тэмперамент. На сходзе аднавяскоўцы вылучаюць яе ў акруговую камісію па выбарах у Народнае Сабранне, потым—членам сельсовета. У маі мы бачым яе агентам Заблудаўската райупаўнаркамзага. На гэтай рабоце яна паказала сябе здольнай работніцай. Тав. Семенюк накіроўваецца ў Беласток на курсы па падрыхтоўцы старшынь сельскіх советаў. Выдатна скончыўшы вучобу, яна працуе старшынёй Агародніцкага сельсовета.

Ольга Максімаўна добра ведае ўсе вёскі і паселішчы свайго сельсовета, ведае людзей. Усяго два з паловай месяцы працуе старшынёй сельсовета Ольга Максімаўна, і яна з глыбокім задавальненнем адзначае вынікі сваёй работы. Раней, дзе цяпер сельсовет, было глухое месца. Цяпер тут людна, сяляне смела ідуць у свой сельскі совет вырашаць жыццёвыя пытанні.

Сельсовет тэлефанізіраван. Ён звязан з раёнам і абласцю. Дом былога памешчыка Модэля перабсталёўваецца ў медыцынскі пункт. Тут будзе і пошта.

Агародніцкі сельсовет паспяхова скончыў усе сельскагаспадарчыя работы, за што атрымаў пераходны чырвоны сцяг ад Заблудаўскага райкома партыі і райвыканкома. Сотні дзяцей былых батракоў і беднякоў вучацца ў школах. Вучацца і ўсе дзеці Ольгі Максімаўны. Муж яе працуе цяпер настаўнікам.

— Каб быць справядлівай,—гаворыць тав. Семенюк,—трэба сказаць, што ў першыя дні маёй работы многія сяляне пагаварвалі: «Бабу пасадзілі ў сельсовеце — толку не будзе». Трэба было заваяваць давер'е людзей.

Чэснай і адданай працай, чулымі адносінамі да людзей заваявала гэтае давер'е тав. Семенюк. У сельсовет ідуць сяляне і сялянкі, як у сваю родную хату, кожны па сваёй справе. Аднойчы да старшыні сельсовета прыйшла жонка аднаго совецкага работніка, які пражывае на тэрыторыі сельсовета. Яна скардзілася, што муж да яе дрэнна адносіцца, не звяртае ўвагі на сваіх дзяцей. Тав. Семенюк выклікала да сябе гэтага «мужа» і дала яму зразумець, што ён жыве пры совецкай уладзе, а не пры панах.

Уперадзе—велізарная работа па будаўніцтву новага жыцця. Сумесна з перадавымі людзьмі вёскі гэту адказную работу выканае тав. Семенюк. І не памыліліся аднавяскоўцы, якія на агульным сходзе вылучылі кандыдатуру сваёй зямлячкі — Ольгі Максімаўны Семенюк у дэпутаты абласнога Совета дэпутатаў працоўных.

Г. Голанд.

Кандыдаты ў дэпутаты раённых Советаў

★ ★ ★

Тацьяна Цімафееўна Рэмжук

Таня старэйшая дачка ў сям'і Рэмжук. Калі ёй споўнілася 12 год, бацька сказаў: «Вось што, Таня, я ўгаварыў пана Кавеліна, і ён згадзіўся прыняць цябе на работу. Будзеш зарабляць сабе на хлеб. Сама бачыш, як нам цяжка жыць».

І Таня пайшла працаваць к пану Кавеліну за кавалак хлеба. Горкі быў гэты хлеб. Ад цямна да цямна трэба было працаваць на панскім агародзе. Змучаная, позна ўвечары Таня лажылася спаць.

— Мама, — гаварыла Таня, —я хачу вучыцца.

— Трэба, дачка мая, працаваць, заробіш грошы, а потым пойдзеш вучыцца,—адказвала маці.

Аднак з вялікімі цяжкасцямі Таня пачала вучыцца. Скончыла 7 класаў. Бацька, перабіваючыся на грашы, усімі сіламі стараўся даць магчымасць вучыцца дачцы.

Вучылася Таня добра. Яна марыла стаць настаўніцай, выхоўваць маладое пакаленне. Але дзверы для далейшай вучобы аказаліся для Тані закрытымі. Два-тры злотых у дзень, якія зарабляў бацька, не хапала на хлеб, і Таня вымушана была пакінуць вучобу і дапамагаць бацьку. Паступіць на фабрыку або на завод не было магчымасці, бо было вялікае беспрацоўе. Цэлымі днямі хадзіла Таня па Беластоку ў пошуках работы і нічога не знаходзіла. Яна пачала займацца вышываннем, працавала па 16 гадзін за паўтара злотых.

Так праходзілі дні, тыдні, месяцы... годы. Таня забыла аб сваёй мары. Яна думала толькі аб сённяшнім дні, каб як-небудзь пракарміцца і прынесці кавалак хлеба малым братам.

Польска-германская вайна застала сям'ю Рэмжук беспрацоўнай. У хуткім часе прыйшла Чырвоная Армія, якая прынесла на сваіх сцягах свабоду, работу, хлеб і шчасце працоўным. З вялікай радасцю Тацьяна Цімафееўна прыйшла ў Часовае ўпраўленне.

— Хачу працаваць. Дайце мне работу!

І Тацьяна пачала працаваць буфетчыцай у тэатры. Адкрыліся педагагічныя курсы. Таня, даўно марыўшая стаць настаўніцай, паступае на гэтыя курсы. Хутка прабягаюць дні напружанай вучобы. Тацьяна набывае веды совецкага настаўніка. Курсы яна закончыла на «добра», і яе накіравалі на работу ў вёску Смолева.

У вёску Тацьяна Цімафееўна Рэмжук прыбыла позна ўвечары. Пазнаёмілася са школай і загадчыкам. Заўтра — заняткі. Які страх перажывала ў гэту ноч яна! Ёй не верылася, што ў недалёкім мінулым дачка беспрацоўнага рабочага, сама беспрацоўная, увойдзе ў клас да дзяцей і будзе іх вучыць. Яна зразумела ўсю адказнасць, якая ўскладалася на яе.

Першыя заняткі прайшлі добра. Дзеці палюбілі сваю настаўніцу. Другі клас, які раней лічыўся адным з адсталых, пачаў падцягвацца. Палепшылася дысцыпліна ў школе. Тацьяна Цімафееўна добра рыхтуецца да заняткаў. Доўга сядзіць вечарамі, многа чытае, складае канспекты і ўрокі вядзе цікава. Па ініцыятыве Тацьяны Цімафееўны створаны пры школе вячэрнія курсы дарослых. Лік слухачоў на гэтых курсах з кожным днём ўзрастае. Спачатку іх наведвала 16 чалавек, а зараз — 25.

Тав. Рэмжук не толькі добры педагог, але і добры грамадскі работнік. Цяпер яна працуе агітатарам па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, растлумачвае сялянам Сталінскую Канстытуцыю, Палажэнне аб выбарах. Усе сяляне вёскі Смолева з вялікай ахвотай наведваюць заняткі.

Сяляне, былыя батракі маёнтка Коскі, аднадушна вылучылі Тацьяну Цімафееўну Рэмжук кандыдатам у дэпутаты у Чыжаўскі раённы Совет дэпутатаў працоўных.

Вылучаючы яе кандыдатуру, былы батрак Кузенскі Юзеф сказаў:

— Тацьяна Цімафееўна — гэта наш чалавек і яна апраўдае наша давер'е.

— Не хочацца верыць—гаворыць Тацьяна Цімафееўна. — Нядаўна я была беспрацоўная, а цяпер мая мара ажыццявілася — я стала совецкім педагогам. Народ аказвае мне вялікае давер'е, вылучыўшы маю кандыдатуру ў раённы Совет. Толькі ў краіне Советаў, сагрэтай сталінскім сонцам, чалавек можа знайсці сабе шчасце.

Н. Шашок.



На здымку: ткачы-стаханаўцы 2-га тэкстыльнага камбіната тт. А. Н. Вільчэўскі і І. Я. Нятупскі, якія выконваюць нормы на 118 процантаў і даюць прадукцыю лепшай якасці.

Фота А. Сапіра.

НА ВЫБАРЧЫХ УЧАСТКАХ

Работа нашага ўчастка

Наш выбарчы ўчастак змяшчаецца ў памяшканні інтэрната настаўніцкага інстытута. Як толькі горвыканком вызначыў вуліцы, уваходзячыя ў наш участак, мы адразу прыступілі да яго абсталявання, своечасова закончылі афармленне яго. Пры ўваходзе ў памяшканне — два вялікія партрэты правадыроў народа Леніна і Сталіна. Уверсе—герб СССР, унізе—лозунгі. У сярэдзіне памяшканне ўпрыгожана выбарчымі лозунгамі, плакатамі, партрэтамі.

Участак стаў любімым месцам для выбаршчыкаў. Тут устаноўлена дзяжурства членаў камісіі, якія даюць адказы выбаршчыкам на ўсе цікавячыя іх пытанні. Па вечарах дзяжураць і агітатары. Праведзены таксама два сходы выбаршчыкаў, на якіх прысутнічала 300 чалавек. На сходах прачытаны даклады аб задачах выбаршчыкаў у сувязі з прадстаячымі выбарамі ў мясцовыя Советы, аб дасягненнях краіны і горада Гродна за годы совецкай улады.

На выбарчым участку выпушчан першы нумар насценнай газеты «Голас выбаршчыка», у якой паказана агітмасавая работа на ўчастку. Газета выпускаецца на рускай, польскай і яўрэйскай мовах.

Галоўная і адказная работа зараз на ўчастку — гэта праверка спіскаў выбаршчыкаў. На нашым участку па выбарчых спісках налічваецца 1.020 чалавек. Трэба адзначыць, што да складання спіскаў горвыканком падышоў безадказна. Аб гэтым гаворыць праверка. З правераных 300 чалавек аказалася, што ў 93 пераблытаны прозвішчы, год нараджэння. 43 чалавекі зусім не ўнесены ў выбарчыя спіскі. Вялікую дапамогу ў праверцы спіскаў аказваюць агітатары.

Мы прымем усе меры, каб узорна сустрэць дзень выбараў у мясцовыя Советы.

Т. Сіпчанка,

старшыня ўчастковай выбарчай камісіі ўчастка № 4, гор. Гродна.

Выправіць памылкі ў спісках

У Ломжынскім раёне дзейсна праходзіць падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. На ўчастках сістэматычна вядзецца агітацыйна-масавая работа. Сюды з ахвотай прыходзяць выбаршчыкі паслухаць лекцыі і гутаркі агітатараў. Ва ўсіх 13 выбарчых участках вывешаны спіскі выбаршчыкаў. Кожны дзень дзесяткі выбаршчыкаў правяраюць правільнае занясенне іх у спіскі. Пры праверцы знаходзіцца многа памылак.

На выбарчым участку № 1 (выбарчая акруга № 15) спіскі падпісаны не старшынёй горвыканкома, а старшынёй участковай камісіі тав. Новікавым. На выбарчых участках № 5 (16 выбарчая акруга) і № 4 (15 выбарчая акруга) у спісках большасці выбаршчыкаў не поўнасцю імёны, а ўказаны толькі ініцыялы, у некаторых прапушчаны прозвішчы. Спіскі выбаршчыкаў зусім не падпісаны. Ёсць выпадкі скажэнняў прозвішчаў.

На выбарчым участку № 3 (15 выбарчай акругі) у спісках у некаторых выбаршчыкаў прапушчаны прозвішчы, а ўказаны толькі імя і імя па бацьку. На выбарчым участку № 2 (15 выбарчая акруга) у спісак выбаршчыкаў запісаны два чалавекі, якія даўно памёрлі. У большасці спіскаў на ўчастку не ўказаны нумары акруг па выбарах у абласны Совет. Такіх прыкладаў няправільных запісаў у спісках можна прывесці многа. Усе яны гавораць аб тым, што да складання спіскаў падышлі не па-сур'ёзнаму, не так, як патрабуе выбарчы закон. Да дня выбараў асталіся лічаныя дні. Неабходна ў самы кароткі тэрмін выправіць дапушчаныя памылкі.

П. Грышчанка.

Агітатары мястэчка Індуры

Памяшканне індурскага Дома соцкультуры па-святочнаму ўпрыгожана. Па вечарах тут ажыўлена. Сюды прыходзяць выбаршчыкі, каб пачытаць газеты, паслухаць агітатара, праверыць сябе ў спісках.

Участак стаў цэнтрам агітацыйна-масавай работы сярод выбаршчыкаў. Пры ім ёсць 25 агітатараў, якія аб'яднаны ў агіткалектыў. Агіткалектывам кіруе загадчык домам соцкультуры тав. Эпштэйн. Другім калектывам кіруе дырэктар няпоўнай сярэдняй школы тав. Смірноў.

У мястэчку налічваецца 25 гурткоў, якімі ахоплена 800 чалавек, праведзена па 4—5 заняткаў. У гуртках агітатараў Соні Назакоўскай, Сары Агунінай закончылі вывучэнне Палажэння аб выбарах і зараз прыступілі да вывучэння Сталінскай Канстытуцыі. Цікавыя гутаркі праводзіць малады агітатар тав. Рубінзон. Часта па просьбе выбаршчыкаў ён чытае ім газеты.

Агітатар т. Сегал у сваіх гутарках умела выкарыстоўвае мясцовыя матэрыялы з нядаўняга мінулага і сучаснага свайго мястэчка. Агітацыйную работу ён увязвае з бягучымі гаспадарчымі задачамі. На вуліцы «17 верасня», дзе ён праводзіць заняткі, многія жыхары не выязджалі на будаўніцтва дарогі. Тав. Сегал правёў з імі гутарку, расказаўшы аб правах і абавязках грамадзян СССР, аб вопыце будаўніцтва Ферганскага канала. Пасля гутаркі грамадзяне чэсна выконваюць свае абавязкі.

Комсамольская арганізацыя мястэчка зразумела свае задачы, і ў выбарчай кампаніі комсамольцы выступаюць як надзейныя памочнікі большэвіцкай партыі. У арганізацыі налічваецца 12 комсамольцаў. Усе яны актыўна ўдзельнічаюць у выбарах. Частка з іх працуе ва ўчастковых і акруговых камісіях, астатнія — агітатарамі.

Вось комсамолка Мар'я Савелава. Перш чым ісці на заняткі, яна ўдумліва і сур'ёзна рыхтуецца да іх, чытае неабходную літаратуру, складае канспект. Са сваімі слухачамі яна закончыла вывучэнне выбарчага закона. Выбаршчыкі кожны раз астаюцца задаволенымі яе гутаркай.

Г. Лупсякоў.

Гродненскі раён.

120 год з дня нараджэння правадыра сусветнага пролетарыята Фрыдрыха Энгельса

★ ★ ★

ВЯЛІКІ НАСТАЎНІК І ПРАВАДЫР ПРОЛЕТАРЫЯТА

Народы нашай краіны і працоўныя ўсяго свету адзначаюць 28 лістапада знамянальную дату — стодваццацігоддзе са дня нараджэння Фрыдрыха Энгельса.

У сазнанне мільёнаў працоўных: рабочых, сялян, інтэлігенцыі — Фрыдрых Энгельс увайшоў як бліжэйшы друг і саратнік Карла Маркса, вялікі настаўнік пролетарыята, палкі барацьбіт за справу комунізма.

Маркс і Энгельс, геніяльныя вучоныя і рэволюцыянеры, выпрацавалі тэорыю навуковага комунізма — тэорыю вызваленчага руху пролетарыята, здольнага збавіць усё чалавецтва ад эксплаатацыі. Маркс і Энгельс першыя ўказалі на гістарычную ролю рабочага класа як магільшчыка буржуазіі і творца новага, комуністычнага жыцця, жыцця без эксплаататараў і прыгнятальнікаў. Маркс і Энгельс вучылі, што пабудаваць бяскласавае соцыялістычнае грамадства рабочы клас можа толькі шляхам пролетарскай рэволюцыі і пролетарскай дыктатуры. А для гэтага рабочы клас павінен мець сваю партыю, якую Маркс і Энгельс назвалі комуністычнай.

Адзін з асновапаложнікаў навуковага комунізма, стваральнік рэволюцыйнай тэорыі пролетарыята, Энгельс быў геніяльным мысліцелем, выдатным вучоным, які рушыў уперад многія галіны навукі і веды. Але перш за ўсё Энгельс быў рэволюцыянерам, неўкрацімым пролетарскім барацьбітом, правадыром прыгнечаных мас.

Маркс і Энгельс арганізавалі «Саюз комуністаў» і стаялі ля калыскі I Інтэрнацыянала—міжнароднай партыі пролетарыята. Маркс і Энгельс кіравалі I Інтэрнацыяналам, усямерна ўзмацняючы ў ім дух пролетарскага інтэрнацыяналізма, павышаючы боездольнасць рабочых партый для рашучых сутычак з буржуазіяй. З якім захапленнем Маркс і Энгельс віталі Парыжскую комуну—першы зародыш пролетарскай улады!

З усёй страснасцю непрымірымага барацьбіта Энгельс абрушваўся на апартуністаў, на раскольнікаў адзінства рабочага класа. Энгельс бічаваў пасіўнасць, прымірэнцтва; ён бязлітасна граміў адступнікаў ад рэволюцыйнага марксізма, здраднікаў рабочага класа.

Сапраўды інтэрнацыянальны правадыр, Энгельс выдатна ведаў рабочы рух Цэнтральнай Еўропы, быў у курсе падзей у Італіі, на Пірэнейскім паўвостраве, на Балканах; ён пабываў за акіянам, у Амерыцы, і ў Скандынавіі. Зорка сачыў ён за падзеямі ў Расіі, змагаўся з народнікамі — злейшымі ворагамі марксізма ў Расіі. Энгельс геніяльна прадказаў, што Расія высока падыме над светам сцяг пролетарскай барацьбы. Прарочаскія словы Энгельса збыліся: рабочы клас СССР першы звергнуў уладу буржуазіі і прывёў народы буйнейшай дзяржавы свету да перамог соцыялізма, да перамог бяссмертных ідэй Маркса і Энгельса. Прыклад народаў СССР натхняе міжнародны пролетарыят на барацьбу за сваё вызваленне.

Узняты вялікім Леніным рэволюцыйны сцяг марксізма ўстаноўлен большэвікамі на адной шостай зямнога шара. Ленін і Сталін адстаялі марксізм ад нападкаў ворагаў, аднавілі рэволюцыйны змест марксізма, замураўлены здраднікамі і апартуністамі з II Інтэрнацыянала.

Вялікія рэволюцыйныя правадыры, геніяльныя прадаўжальнікі марксісцкага вучэння, Ленін і Сталін развілі марксізм далей, у новых умовах класавай барацьбы, прымяняльна да эпохі імперыялізма і пролетарскіх рэволюцый. «Можна сказаць без пераўвелічэння, што пасля смерці Энгельса велізарнейшы тэарэтык Ленін, а пасля Леніна — Сталін і іншыя вучні Леніна — былі адзінымі марксістамі, якія рухалі ўперад марксісцкую тэорыю і абагацілі яе новым вопытам у новых умовах класавай барацьбы пролетарыята» («Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», стар. 342).

Вучэнне Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна стала ў СССР дзяржаўным вучэннем. Большэвікі, партыйныя і непартыйныя, совецкая інтэлігенцыя, перадавыя рабочыя і сяляне вывучаюць творы класікаў марксізма-ленінізма, авалодваюць большэвізмам. Светач марксісцка-ленінскай навукі — крыніца сілы, натхняючай мільёны будаўнікоў комунізма.

Справа Маркса — Энгельса — Леніна—Сталіна вастаржаствавала ў СССР. Марксізм-ленінізм вастаржаствуе ва ўсім свеце!

Энгельс аб Расіі

Вялікія правадыры рабочага класа Маркс і Энгельс ведалі рускую мову, чыталі рускія кнігі, «жыва цікавіліся Расіяй, з пачуццём сачылі за рускім рэволюцыйным рухам і падтрымлівалі адносіны з рускімі рэволюцыянерамі» (Ленін, т. 1, стар. 415).

Энгельс незвычайна ўважліва вывучаў унутранае палітычнае становішча Расіі; столькі-ж старанна ён вывучаў знешнюю палітыку царскага ўрада. Гэта тлумачыцца выключным значэннем Расіі для лёсаў сусветнага рэволюцыйнага руху. Царызм падаўляў рэволюцыйны рух не толькі ўнутры Расіі. Вядома, напрыклад, што для падаўлення рэволюцыі 1848 г. у Венгрыі рускі імператар Нікалай I паслаў на дапамогу аўстрыйскаму імператару 130-тысячную армію.

Старанне вывучэнне абстаноўкі ўмацоўвала думку Маркса і Энгельса аб непазбежнасці рэволюцыйнага ўзрыву ў Расіі. Энгельс прадказваў, што гэта будзе народная рэволюцыя, якая акажа каласальны ўплыў на ход і развіццё барацьбы заходнееўрапейскага пролетарыята. Энгельс прадугадваў, што Расіі суджана стаць новым цэнтрам сусветнага рэволюцыйнага руху.

Пасля смерці Маркса Энгельс аддзяляў многа сіл таму, каб рускія рэволюцыянеры сустрэлі набліжаючыйся рэволюцыйны ўздым ва ўсеоружжы марксісцкай тэорыі.

У Расіі ў той час былі распаўсюджаны рознага роду дробна-буржуазныя тэорыі, прапаведуемыя народнікамі, злейшымі ворагамі марксізма і рабочага класа. Энгельс бязлітасна разбіваў антырэволюцыйныя сцвярджэнні народнікаў, якія ў сялянскай абшчыне бачылі зародыш соцыялізма. Энгельс тлумачыў, што ў вёсцы ёсць і багачы і беднякі, ёсць людзі, жывучыя сваёй працай, але ёсць і эксплаататары. Народнікі не разумелі класавай будовы рускага грамадства, адмаўлялі неабходнасць класавай барацьбы працоўных. У процілегласць народнікам Энгельс лічыў, што «неабходна перш за ўсё звяржэнне царскага дэспатызма, неабходна рэволюцыя ў Расіі».

Дваране, кулакі, растаўшчыкі, скупшчыкі — «усе гэтыя, — як гаварыў Энгельс, — крывапіўцы, якія смокчуць сялян», — былі зацікаўлены ў захаванні царызма, які абараняў іх інтарэсы.

Класавы характар рускай дзяржавы быў ускрыт Энгельсам з вычарпальнай паўнатой.

Выказванні Энгельса па разнастайных пытаннях рускага грамадскага жыцця садзейнічалі пранікненню ў Расію ідэй навуковага соцыялізма. Дзейнасць Энгельса палягчала перадавым людзям Расіі выбар правільнай рэволюцыйнай тэорыі і правільных марксісцкіх спосабаў барацьбы. Для рускіх рэволюцыянераў кожнае выказванне Энгельса служыла зброяй незвычайнай сілы. Як радаваўся Энгельс, калі ён бачыў першыя рэзультаты сваёй работы!

«...Я ганаруся тым, — пісаў Энгельс у 1885 годзе, — што сярод рускай моладзі існуе партыя, якая шчыра і без агаворак прыняла вялікія эканамічныя і гістарычныя тэорыі Маркса». Так пісаў Энгельс аб групе «Вызваленне працы», якая многа зрабіла для распаўсюджання ідэй марксізма ў Расіі.

Але гэта група не была практычна звязана з рабочым рухам. Толькі партыя большэвікоў, створаная Леніным, звязала вучэнне Маркса і Энгельса з рабочым рухам, тэорыю—з практыкай.

Энгельс геніяльна прадбачыў, што сялянства Расіі выйдзе з галечы толькі з дапамогай пролетарскай рэволюцыі. Энгельс пісаў, што руская рэволюцыя «знішчыць разабшчонасць вёсак, у якіх жыве галоўная маса нацыі, сяляне», што рэволюцыя «выведзе сялян на шырокую арэну». Энгельс прадказваў, што ва ўмовах дыктатуры пролетарыята сялянства з дапамогай рабочага класа зможа перайсці да грамадскай апрацоўкі зямлі.

Значэнне надыходзячай рускай рэволюцыі Энгельс бачыў і ў тым, што яна дасць новы штуршок рабочаму руху Захада.

Выказванні Энгельса аб Расіі аказаліся прароцкімі. Расія — першая краіна, дзе перамог рабочы клас, першая краіна, дзе вастаржаствавалі бяссмертныя ідэі Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна.

М. Кавалёў.



ФРЫДРЫХ ЭНГЕЛЬС

(Біяграфічная даведка)

Вялікі правадыр сусветнага пролетарыята Фрыдрых Энгельс нарадзіўся 28 лістапада 1820 года ў горадзе Бармене (Рэйнская область Германіі), у сям'і тэкстыльнага фабрыканта. З дзяцінства ён наглядаў жыццё, умовы працы і быту прамысловых рабочых, эксплаатуемых капіталістамі.

Вучыўся Энгельс спярша ў рэальным вучылішчы, затым у гімназіі.

Дзевятнаццаці год Энгельс парваў з рэлігіяй. Ён ненавідзеў манархію і дэспатызм, адчуваў агіднасць да ўсяго прыгнечання.

У 1842 годзе, адбыўшы тэрмін ваеннай службы, Энгельс пераехаў у Англію. У Манчэстэры — цэнтры буйнай англійскай тэкстыльнай прамысловасці — Энгельс яшчэ бліжэй знаёміцца з жыццём рабочых кварталаў, збірае матэрыялы і дакументы аб умовах працы рабочых. Усе гэтыя звесткі Энгельс выкарыстаў у сваёй працы «Становішча рабочага класа ў Англіі» (1845 г.). Гэтай кнігай Энгельс першы сказаў, што рабочыя самі сабе дапамогуць у барацьбе з эксплаататарамі, што цяжкае становішча рабочага класа прымушае яго змагацца за сваё вызваленне.

У 1844 годзе завязалася вялікая дружба Энгельса з Марксам.

Энгельс сумесна з Марксам стварылі партыю пролетарыята. У 1847 годзе ўзнік «Саюз комуністаў», мэтай якога з'яўлялася «звяржэнне буржуазіі, панаванне пролетарыята».

Па даручэнню «Саюза комуністаў» Маркс і Энгельс напісалі яго праграму — «Маніфест Комуністычнай партыі». У «Маніфесце» яны праўзгласілі лозунг: «Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!». У іншых сумесных работах Маркса і Энгельса («Святое сямейства», «Нямецкая ідэалогія») таксама ізлагаліся асноўныя тэарэтычныя палажэнні навуковага комунізма.

У 1848 годзе, калі ў Германіі выбухнула рэволюцыя, Энгельс сумесна з Марксам прыязджаюць на радзіму. Тут, у горадзе Кельне, яны кіравалі палкай рэволюцыйнай газетай («Новая Рэйнская газета») і вялі рэволюцыйную работу. У 1849 годзе Энгельс прыняў асабісты ўдзел у народным паўстанні.

Пражываючы ў Манчэстэры, Энгельс напісаў мноства артыкулаў, асабліва па ваенных пытаннях.

Энгельс уладаў дваццацю пяццю замежнымі мовамі, у тым ліку і рускай. Веды замежных моў вельмі дапамаглі Энгельсу ў справе кіраўніцтва інтэрнацыянальным рухам рабочага класа. Сумесна з Марксам Энгельс быў арганізатарам I Інтэрнацыянала, барацьбітом за пролетарскую партыю. Энгельс, як і Маркс, быў непрымірымым барацьбітом з апартуністамі, з ворагамі рабочага руху.

Кіраўнікі I Інтэрнацыянала — Маркс і Энгельс — горача віталі Парыжскую комуну 1871 года, як першы вопыт дыктатуры пролетарыята.

14 сакавіка 1883 года памёр К. Маркс. Ён не паспеў пры жыцці падрыхтаваць да выпуску II і III тамы «Капітала». Верны друг Маркса, Энгельс узяўся за гэту справу. Ён апрацаваў рукапісы II і III тамоў «Капітала» і апублікаваў іх.

Ні на мінуту не пакідаў ён партыйна-палітычнай дзейнасці. Як гаварыў Ленін, пасля смерці Маркса Энгельс адзін працягваў быць саветнікам і кіраўніком еўрапейскіх соцыялістаў.

У апошнія годы жыцця Энгельс многа цікавіўся Расіяй, змагаўся супроць народніцтва і горача падтрымліваў першых рускіх марксістаў.

Памёр Энгельс 5 жніўня 1895 года ў Лондане.

★ ★ ★

ВЯЛІКАЯ ДРУЖБА

Дружба, як благароднейшае пачуццё, успета паэтамі. Аб чуллівых прыкладах дружбы расказваюць сказанні і лягенды старажытных. «...Пролетарыят можа сказаць, што яго навука створана двума вучонымі і змагарамі, адносіны якіх пераўзыходзяць усе самыя чуллівыя сказанні старажытных аб чалавечай дружбе». Так пісаў Ленін аб Карле Марксе і Фрыдрыху Энгельсе.

Імёны Маркса і Энгельса ў сазнанні працоўных усяго свету існуюць непадзельна.

Пладом іх геніяльнай мыслі, рэзультатам велізарнай працы з'явіўся новы светапогляд, навуковая тэорыя, якая не толькі аб'ясніла мінулае чалавецтва і яго сучаснае, але і ўказала адзіна правільны шлях да вызвалення ад прыгнятальнікаў і стварэння бяскласавага соцыялістычнага грамадства. Абагульваючы вопыт класавай барацьбы пролетарыята з буржуазіяй, Маркс і Энгельс навукова абгрунтавалі непазбежнасць пролетарскай рэволюцыі, непазбежнасць перамогі комунізма.

Пролетарыят — магільшчык капіталізма. Ён павінен павесці за сабой усіх працоўных на шлях беззаветнай барацьбы за дыктатуру пролетарыята, за комунізм.

Маркс і Энгельс былі мысліцелі-рэволюцыянеры. Іх стыхіяй была рэволюцыйная барацьба з буржуазіяй за справу пролетарыята, за шчасце ўсіх працоўных. У агні гэтай барацьбы і нарадзілася вялікая, самаадданая дружба двух геніяльных мысліцеляў і змагароў. Дружба гэта цягнулася 40 год.

Сумесна Маркс і Энгельс пачалі распрацоўку новага светапогляду, тэорыі навуковага соцыялізма. Першыя іх кнігі, у якіх ізлагаліся асноўныя палажэнні новай тэорыі, былі напісаны імі сумесна («Святое сямейства», «Нямецкая ідэалогія», «Маніфест Комуністычнай партыі»).

Маркс і Энгельс дапамагалі друг другу ў працы, у творчасці. У герайчнай барацьбе за справу рабочага класа мацавалася і загартоўвалася дружба двух найвялікшых рэволюцыянераў. Маркс і Энгельс стварылі першую пролетарскую марксісцкую арганізацыю — «Саюз комуністаў», — а затым Першы Інтэрнацыянал — Міжнароднае таварыства рабочых.

Увесь жыццёвы шлях, шлях беззаветнай барацьбы, поўны няўзгод і лішэнняў, часовых паражэнняў і слаўных перамог, пройдзен Марксам і Энгельсам разам, рука аб руку, плячом к плячу. Энгельс прakланяўся перад веліччу генія Маркса. Яго любоў да свайго друга была бязмежная. Маркс высока цаніў свайго друга Энгельса за ўсебаковасць яго пазнанняў, за востры і глыбокі розум, за прынцыповасць у барацьбе, за нянавісць да буржуазіі, за любоў да рабочага класа.

Імёны Маркса і Энгельса былі ненавісны буржуазіі і яе ўрадам. Маркс амаль усё сваё жыццё правёў у выгнанні. Яго травілі і праследвалі манархічныя і рэспубліканскія буржуазныя ўрады. Мысліцель, роўнага якому не ведала ўся папярэдняя гісторыя, ён ўсё жыццё цярпеў нужду і лішэнні. Калі-б не самаадданая падтрымка яго друга — Энгельса, — Маркс наўрад ці змог-бы закончыць «Капітал», галоўную працу свайго жыцця.

Каб падтрымаць друга, даць яму матчымасць закончыць «Капітал» і тым самым выканаць партыйны доўг, Энгельс пайшоў на службу ў гандлёвую фірму, пачаў займацца нелюбімай справай.

Маркс пры жыцці паспеў поўнасцю закончыць і апублікаваць толькі першы том «Капітала». А два томы асталіся ў рукапісах і мелі яшчэ патрэбу ў канчатковай апрацоўцы. Энгельс аставіў усе свае навуковыя працы і справай свайго жыцця лічыў падрыхтоўку да публікацыі, апрацоўку работы Маркса. На гэта ён патраціў каля дзесяці год дасканалай, крапатлівай работы. Некаторыя раздзелы працяга тома «Капітала» былі не закончаны, некаторыя з іх мелі некалькі накідкаў. Почарк Маркса быў крайне неразборчывы. І вось стары Энгельс на працягу многіх год сядзеў дні і ночы, таропячыся выпусціць працу свайго вялікага друга. Ён ведаў больш чым хто-небудзь, што гэтая праца — самая галоўная і самая магутная ідэйная зброя рабочага класа.

Смерць Маркса была цяжкім горам для Энгельса, для ўсіх тых, хто прысвяціў сваё жыццё пролетарскай рэволюцыі.

Пасля смерці Маркса гіганцкая работа па кіраўніцтву міжнародным пролетарскім рухам цалкам выконвалася адным Энгельсам. Ён быў, па словах Леніна, саветнікам і кіраўніком соцыялістаў еўрапейскіх краін. Ужо стары, Энгельс з юнацкай бадзёрасцю і жарам вёў дзень за днём велізарную тэарэтычную і практычную работу, каваў вялікую армію соцыялістычнай рэволюцыі, абараняў, развіваў і прапагандыраваў вялікія ідэі марксізма.

Кожная новая перамога марксізма бязмежна радавала сэрца вялікага рэволюцыянера. Ён толькі з сумам усклікаў: «О, калі-б Маркс дажыў да гэтага!».

У 1893 годзе, на Цурыхскім кангрэсе Інтэрнацыянала, Энгельсу быў наладжан захапляючы прыём дэлегатамі кангрэса. У сваёй прамове ён заявіў, што ён тэтыя прывітанні адносіць не да сябе асабіста і прымае іх «толькі як супрацоўнік вялікага чалавека, ізабражэнне якога вісіць вось там», — Энгельс паказаў на партрэт Маркса.

Маркс і Энгельс былі вялікія ва ўсім: у нянавісці да ворагаў рабочага класа, у бязмежнай любві да працоўных, у непахіснай веры ў таржаство комунізма, у чуллівай сваёй дружбе. Такую дружбу магла нарадзіць толькі вялікая ідэя, толькі беззаветнае служэнне справе рабочага класа, толькі барацьба за свабоду і шчасце чалавецтва. Гэта мы бачым і на прыкладзе вялікага садружаства геніяльных прадаўжальнікаў справы Маркса і Энгельса—Леніна і Сталіна. Толькі вызваленчая барацьба рабочага класа магла выкаваць такую благародную, верную да канца дружбу, як дружба Маркса і Энгельса, Леніна і Сталіна.

Прафесар **Ф. Канстанцінаў.**

ГАЛОЎНЫЯ ПРАЦЫ ФРЫДРЫХА ЭНГЕЛЬСА

Фрыдрых Энгельс — вялікі правадыр сусветнага пролетарыята, бліжэйшы друг і саратнік Карла Маркса — быў геніяльным мысліцелем. Яго пяру належаць выдатныя творы па самых розных галінах навукі. Усе яны прасякнуты адной ідэяй, служаць адной задачы —вызваленню рабочага класа ад капіталістычнага прыгнечання, барацьбе за пролетарскую, соцыялістычную рэволюцыю.

Рад работ Энгельс напісаў сумесна з Марксам. Да ліку сумесных тварэнняў асновапаложнікаў навуковага комунізма адносяцца вялікія філасофскія творы: «Святое сямейства» і «Нямецкая ідэалогія». Марксам і Энгельсам сумесна напісана і першая праграма комуністаў — «Маніфест Комуністычнай партыі». На долю Энгельса выпала велізарная работа па падрыхтоўцы да друку і па выданню астаўшыхся пасля смерці Маркса рукапісаў II і III тамоў «Капітала». Ленін пісаў, што «гэтыя два тамы «Капітала» — праца двух: Маркса і Энгельса» (Ленін, т. I, стар. 414).

Энгельс меў велізарныя, усебаковыя пазнанні. Ён напісаў многа глыбокіх твораў па філасофіі, тэарэтычнаму прыродазнаўству, палітычнай эканоміі, тэорыі навуковага соцыялізма, яму належаць цудоўныя гістарычныя творы і выдатныя артыкулы па ваенных пытаннях.

Асноўным творам Фрыдрыха Энгельса, яго буйнейшай працай, з'яўляецца «Пераварот у навуцы, зроблены п. Еўгеніем Дзюрынгам» («Анты-Дзюрынг»). Ленін пісаў, што ў гэтай кнізе «разабраны найвялікшыя пытанні з галіны філасофіі, прыродазнаўства і грамадскіх навук». (Ленін, т. I, стар. 414).

Гэтая кніга Энгельса накіравана супроць ворагаў марксізма. Крытыкуючы путаныя ненавуковыя погляды буржуазнага філосафа Дзюрынга, Энгельс проціпастаўляе ім грунтоўнае ізлажэнне марксісцкіх поглядаў па самых розных пытаннях навукі і філасофіі.

«Анты-Дзюрынг» складаецца з трох аддзелаў: «Філасофія», «Палітычная эканомія» і «Соцыялізм». У першым аддзеле Энгельс ізлагае асноўныя пытанні марксісцкай філасофіі.

У другім аддзеле «Анты-Дзюрынга» Энгельс дае кароткае выкладанне марксісцкай палітычнай эканоміі. Апошні раздзел другога аддзела «Анты-Дзюрынга» напісан Марксам. Маркс і Энгельс заўсёды дапамагалі друг другу ў рабоце.

Трэці аддзел «Анты-Дзюрынга» прысвечан гісторыі і тэорыі соцыялізма. Інтарэсы рабочых і капіталістаў непрымірымыя, яны ўсё больш і больш абвастраюцца з развіццём капіталістычнага грамадства. Пагібель капіталізма непазбежна. Толькі соцыялістычная рэволюцыя можа вырашыць тыя супярэчнасці, у якіх запуталася капіталістычнае грамадства. Соцыялістычная рэволюцыя адкрывае новую эру ў гісторыі чалавецтва, пісаў Энгельс.

У заключных раздзелах «Анты-Дзюрынга» Энгельс развівае марксісцкія погляды на вытворчасць, сям'ю і выхаванне ў соцыялістычным грамадстве.

Другім выдатным філасофскім творам Энгельса з'яўляецца «Людвіг Фейербах». У гэтай невялікай па размерах брашуры Энгельс абгрунтоўвае дыялектычны і гістарычны матэрыялізм, дае глыбокі аналіз ідэалістычнай дыялектыкі Гегеля і матэрыялістычнай філасофіі Фейербаха. У брашуры Энгельса ёсць папулярнае ізлажэнне поглядаў двух процілеглых філасофскіх лагераў: матэрыялістаў і ідэалістаў.

Энгельс на працягу цэлага раду год вывучаў гісторыю прыродазнаўчых навук, уважліва сачыў за навейшымі адкрыццямі навукі: фізікі, хіміі, біялогіі. Кніга Энгельса «Дыялектыка прыроды» утрымлівае глыбокае філасофскае даследванне гісторыі і тэорыі прыродазнаўства. Асаблівае месца займае ў ёй артыкул «Роля працы ў працэсе ачалавечання абезьяны»; у ёй Энгельс даў марксісцкае тлумачэнне паходжання чалавека.

Велізарнае значэнне для вывучэння старажытнага свету мае работа Энгельса «Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы». У гэтай рабоце Энгельс даследваў першабытна-абшчынны лад, гісторыю сям'і, паходжанне прыватнай уласнасці і раздзел працы, працэс узнікнення класаў і паходжання дзяржавы.

Пяру Энгельса належыць таксама рад выдатных гістарычных твораў: «Сялянская вайна ў Германіі», «Рэволюцыя і контррэволюцыя ў Германіі».

Вялікае значэнне мае работа Энгельса «Сялянскае пытанне ва Францыі і Германіі», у якой дана ідэя саюза рабочага класа з сялянствам і пастаўлена пытанне аб пераходзе сялянства да сумеснай таварыскай апрацоўкі зямлі.

Выключна багатую і ўсебаковую літаратурную спадчыну Энгельса, вялікага правадыра і настаўніка міжнароднага пролетарыята, з велізарнай цікавасцю вывучаюць многія мільёны працоўных.

Е. Белевіч.

У АПОШНЮЮ ГАДЗІНУ

ЗАБОЙСТВА РУМЫНСКІХ ПАЛІТЫЧНЫХ ДЗЕЯЧОЎ

БУХАРЭСТ, 27 лістапада. (ТАСС). У журналісцкіх кругах перадаюць, што група жалезнагвардзейцаў уварвалася ў ноч на 27 лістапада ў турму Жылава (ваенная турма блізь Бухарэста) і расстраляла вялікую групу зняволеных, у прыватнасці некаторых былых міністраў і прыбліжоных былога караля Караля. Жалезнагвардзейцамі забіта 64 чалавекі. Сярод забітых былы прэм'ер-міністр і ваенны міністр генерал Арджэшэану, былыя міністры — Ямандзі, Гельмеджэану і Габрыэль Марынеску, генерал Бенгліу, былы начальнік тайнай паліцыі Марузау і іншыя. Перадаюць, што перад тым, як уварвацца ў турму, жалезнагвардзейцы пазбавілі яе сувязі з знешнім светам, парваўшы тэлефонны кабель. Сёння з раніцы ў сувязі з гэтымі падзеямі адбывалася пасяджэнне савета міністраў Румыніі. Да гэтага часу афіцыяльнага камюніке не паявілася. Стала таксама вядома, што сёння ранічой жалезнагвардзейскай (легіянерскай) паліцыяй былі арыштаваны былыя прэм'ер-міністры Жыгурту і Аржэтояну і былы маршал двара генерал Іласіевіч.

АМЕРЫКАНСКІЯ КАРЭСПАНДЭНТЫ АБ ВАЕННЫХ ДЗЕЯННЯХ ПАМІЖ ГРЭЦЫЯЙ І ІТАЛІЯЙ

НЬЮ-ЙОРК, 27 лістапада. (ТАСС). Па паведамленню афінскага карэспандэнта агенцтва Юнайтэд Прэс, буйныя італьянскія падмацаванні пасланы з узбярэжжа на лінію фронта. У сектары Аргірокастрона і Санці-Кваранта развіваецца буйнае сражэнне. Намаганні італьянцаў накіраваны на тое, каб перашкодзіць грэкам адрэзаць іх ад берага. Італьянскія самалёты бамбардыравалі вёскі і масты уздоўж фронта, спрабуючы перарэзаць грэчаскія камунікацыі. Сур'ёзнае сражэнне адбываецца ў сектары Пагралзеца. Грэкі наступаюць уздоўж берага возера Охрыда. Італьянскія самалёты праяўляюць вялікую актыўнасць на паўночным фронце. У некаторых сектарах над лініямі грэчаскіх войск лятала звыш 300 італьянскіх самалётаў. Па паведамленню карэспандэнта, на паўночным фронце амаль кожны горад падвергся бамбардыроўцы.

Як перадае карэспандэнт агенцтва Юнайтэд Прэс з Будапешта, грэчаскае радыё заявіла, што грэчаскія войскі ў некалькіх пунктах на паўднёвым фронце прышлі ў дакрананне з італьянскімі войскамі. На захад ад Корчы грэчаскія войскі прасунуліся на 9 міль, не сустракаючы супраціўлення італьянцаў.

Карэспандэнт агенцтва Асошыэйтэд Прэс, які знаходзіцца з грэчаскай арміяй, паведамляе, што італьянскія самалёты зрабілі інтэнсіўную бамбардыроўку вёсак і грэчаскіх камунікацый на ўсяму паўднёваму сектару фронта.

—о—

ПЛЫВУЧЫЯ МІНЫ ЛЯ БЕРАГОЎ ШВЕЦЫІ

СТАКГОЛЬМ, 27 лістапада. (ТАСС). Моцны штурм прыбіў за апошнія суткі да заходняга ўзбярэжжа Швецыі ў раёне Бухуслен вялікую колькасць мін. У рэзультаце ўзрываў разбуран рад пабудоў, у многіх дамах разбіты шкельцы, частка жыхароў прыбярэжнай паласы адправілася ў глыб краіны. На ўзбярэжжы паміж гарадамі Стрэмстад і Вінга былі заўважаны 54 плывучых міны. Усе судны папярэджаны аб пагражаючай ім у сувязі з гэтым небяспецы.

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 27 лістапада. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае зводку вярхоўнага камандавання германскай арміі:

«У сувязі з неспрыяючымі метэаралагічнымі ўмовамі германская авіяцыя абмежавала свае баявыя дзеянні ў ноч на 26 лістапада і днём 26 лістапада і прарабіла толькі разведку і асобныя налёты. У рэзультаце начной бамбардыроўкі ў Эвенмуту ўзніклі шматлікія пажары. У час атакі англійскага каравана суднаў паблізу Фалмута быў патоплен канвойны карабель водазмяшчэннем у 7 тысяч тон. Ля вусця Тэмзы бомбамі пашкоджаны два гандлёвых параходы сярэдняга танажу.

Дальнабойныя батарэі марской артылерыі ўзялі пад эфектыўны абстрэл судны, якія стаялі ў парту Дуўра.

Англійскія самалёты скінулі ў розных частках Германіі бомбы. Пашкоджана некалькі жылых дамоў. Забіта і ранена некалькі чалавек грамадзянскага насельніцтва. У час беспаспяховага налёту англійскіх самалётаў на германскія вартавыя караблі ў Паўночным моры ўдалося збіць адзін непрыяцельскі самалёт. Другі непрыяцельскі самалёт быў збіт зенітнай артылерыяй. Два германскіх самалёты прапалі без вестак».

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 27 лістапада. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, учора ўночы германская авіяцыя праяўляла нязначную актыўнасць. Некалькі бомб было скінута галоўным чынам на Лондан, у заходняй частцы Англіі і ў адным пункце ў сярэдняй Англіі. Урон і колькасць афяр нязначныя.

У ноч на 27 лістапада англійская авіяцыя бамбардыравала ваенныя аб'екты ў Паўночнай Італіі і Германіі, уключаючы аб'екты Берліна.

Патрабаванні англійскіх рабочых

ЛОНДАН, 27 лістапада. (ТАСС). Рабочыя машына-будаўнічай і суднабудаўнічай прамысловасці Глазго і іншых прамысловых прадпрыемстваў, размешчаных у даліне ракі Клайд (буйнейшая рака ў заходняй Шатландыі), вядуць упартую барацьбу з прадпрыемцамі, якія рашуча адмаўляюцца пайсці на якое-б та ні было павышэнне заработнай платы. Надаўна на некалькіх асноўных судаверфах адбыліся масавыя мітынгі, на якіх былі прыняты рэзалюцыі аб правядзенні аднадзённай забастоўкі, калі прадпрыемцы не зменяць сваёй пазіцыі.

ІТАЛА-ГРЭЧАСКАЯ ВАЙНА

АФІНЫ, 27 лістапада. (ТАСС). У паведамленні грэчаскага міністэрства дзяржаўнай бяспекі гаворыцца, што 26 лістапада самалёты праціўніка бамбардыравалі Ліксурыон (на востраве Кефалінія) і некалькі вёсак у Эпіры. Маюцца афяры сярод грамадзянскага насельніцтва. Востраў Корфу таксама падвергся бамбардыроўцы і кулямётнаму абстрэлу.

ОХРЫД, 27 лістапада. (ТАСС). Учора грэчаская артылерыя абстраляла італьянскія войскі, якія знаходзіліся ля горада Паградзец. Грэкі прасоўваліся ад Корчы на Эльбасан.

САФІЯ, 27 лістапада. (ТАСС). Газета «Зора» піша, што грэкі спрабавалі атакаваць востраў Лерос. Спробы англічан і грэкаў высадзіць падмацаванні ў парту Тігані на востраве Самос адбіты.

НЬЮ-ЙОРК, 27 лістапада. (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Асошыэйтэд Прэс, італьянскія самалёты бамбардыравалі каля 10 вёсак у раёне Эпіра і разнастайныя аб'екты на астравах Корфу і Кефалінія. Па паведамленню агенцтва Юнайтэд Прэс, афінскае радыё аб'явіла, што грэчаскія войскі прасоўваюцца на ўсіх франтах. Італьянскія войскі пад абаронай самалётаў высаджваюцца ў парту Дурацо. У Албанію прыбыло дадаткова некалькі сот італьянскіх самалётаў.

У камюніке камандавання англійскіх ваенна-паветраных сіл, апублікаваным у Каіры, гаворыцца, што англійскія самалёты, базіруючыяся на тэрыторыі Грэцыі, абстралялі з кулямётаў 3 калоны адступаючых італьянцаў у раёне Эльбасана (Албанія).

АФІНЫ, 27 лістапада. (ТАСС). Грэчаскае тэлеграфнае агенцтва перадае наступнае паведамленне вярхоўнага камандавання грэчаскай арміі, апублікаванае ўчора к канцу дня: «Прасоўванне нашых войск з поспехам працягваецца на Албанскай тэрыторыі. У раёне Корчы сярод ваенных матэрыялаў намі захоплена 6 самалётаў, пакінутых праціўнікам. Непрыяцельская авіяцыя праяўляла актыўнасць на фронце і бамбардыравала каля дзесятка вёсак у Эпіры і не маючых ваеннага значэння аб'екты на астравах Корфу і Кефалінія».



ЭКАНАМІЧНАЕ СТАНОВІШЧА ФРАНЦЫІ

ВІШЫ, 27 лістапада. (ТАСС). Французскі ўрад рашыў прыступіць да складання праекта бюджэта на будучы год. Ужо паўгода Францыя фактычна жыве без бюджэта.

У гутарцы з прадстаўнікамі друку міністр фінансаў Буцільё паведаміў, што ў Францыі з мэтай спынення выпуску абясцэньваючыхся папяровых грошай пашыраецца прымяненне сістэмы векселяў і чэкаў, прычым чэкі будуць абарочвацца як плацежны сродак. З мэтай ажыўлення работы прамысловасці дзяржава намерана авансіраваць прадпрыемцаў. Насельніцтву прапанавана закупаць толькі абсалютна неабходную для асабістага спажывання колькасць нерацыяніруемых тавараў. Устанаўліваецца строгі кантроль над знешнім гандлем. Урад намеран у далейшым сурова абмяжоўваць увоз і не дапускаць, каб ён правышаў вываз.

Французскі друк, каментыруючы гэтыя мерапрыемствы, падкрэслівае, што французская народная гаспадарка за апошнія дзесяцігоддзі развівалася як гаспадарка, залежная ад замежных рынкаў, асабліва ад англійскага і амерыканскага. Францыя сістэматычна ўвазіла з Англіі і Амерыкі вялікую колькасць разнастайных тавараў. Залежнасць французскай эканомікі ад заграніцы выражалася таксама ў тым, што ў краіне існавала вялікая колькасць прамысловых і гандлёвых кампаній змешанага характару з удзелам замежнага капітала.


У цяперашні час эканамічныя сувязі Францыі з Англіяй і Амерыкай спыніліся. Сувязі з калоніямі таксама сталі амаль немагчымымі, і Францыі прыходзіцца пагэтаму разлічваць толькі на сваю ўнутраную вытворчасць для задавалення патрэбнасцей 40-мільённага насельніцтва.

Асаблівыя цяжкасці друк прадбачыць у справе расшырэння сельскагаспадарчай вытворчасці з мэтай забеспячэння краіны дастатковай колькасцю харчавання. Гэтыя цяжкасці ў значнай ступені звязаны з тым, што Францыя — краіна дробнай сельскай гаспадаркі. Па апошніх даных, з 4-х мільёнаў сельскіх гаспадарак 2.800 тысяч гаспадарак належыць да ліку дробных, не маючых дастатковых лішкаў сельскагаспадарчых прадуктаў, каб выкінуць іх на рынак і не маючых магчымасці прымяняць сельскагаспадарчыя машыны, каб павялічыць сваю прадукцыйнасць.

—о—

АНГЛІЙСКІ ДРУК АБ ГУТАРЦЫ ГЕНЕРАЛА ДЭ ГОЛЯ З ЧЭРЧЫЛЕМ

ЛОНДАН, 27 лістапада. (ТАСС). Газета «Дэйлі тэлеграф энд Морнінг пост», датыкаючыся адбыўшайся гутаркі генерала дэ Голя з Чэрчылем, піша, што, паміма палітычных пытанняў, абмяркоўваліся таксама праблемы ваеннага, эканамічнага і арганізацыйнага характару. У прыватнасці абмяркоўвалася пытанне аб парадку абучэння, аснашчэння і выкарыстання французскіх войск, якія знаходзяцца зараз у Англіі, аб выкарыстанні рэсурсаў французскіх калоній у Афрыцы для патрэб вайны і аб супрацоўніцтве паміж французскімі калоніямі ў Афрыцы з прылягаючымі да іх англійскімі калоніямі і з бельгійскім Конго. Генерал дэ Ларміна застаецца ў Афрыцы ў якасці вярхоўнага камісара і галоўнакамандуючага войскамі на тэрыторыях, падпарадкаваўшыхся генералу дэ Голю.



У новапабудаванай 25-й яўрэйскай няпоўнай сярэдняй школе ў Беластоку. Фота А. Сапіра.

Урачыстасці ў Навагрудку

НАВАГРУДАК. (Па тэлеграфу ад нашага карэспандэнта). Бурна жыве Навагрудак у гэтыя дні — землякі ўшаноўваюць памяць свайго выдатнага паэта Адама Міцкевіча. Сюды прыехалі маскоўскія, мінскія, беластоцкія пісьменнікі, навуковыя работнікі, брыгада Белдзяржкінохронікі. Музей паэта наведваюць штодзённа сотні экскурсантаў.

Напярэдадні юбілею адбыўся піквы вечар у польскай школе. На вечары прысутнічалі беларуская, польская, яўрэйская пісьменнікі, навуковыя работнікі, настаўнікі. На розных мовах прамоўцы гаварылі, што Міцкевіч дарог усім народам, што юбілей яго з'яўляецца святам усёй савецкай культуры.

Радзіма Адама Міцкевіча не бачыла раней такіх урачыстасцей.

26 лістапада ў Навагрудку адбыўся вялікі юбілейны вечар.

Т. Лясовіч.

Палепшыць работу школ

ЛОМЖА. (Ад нашага карэспандэнта). 1940 — 1941 навучальны год у школах горада Ломжы пачаўся арганізавана. Школы своечасова былі ўкамплектаваны педагагічнымі кадрамі. Праведзен улік дзяцей школьнага ўзросту; усе яны к пачатку навучальнага года былі прызначаны ў школы. Школьныя памяшканні да зімы падрыхтаваны; сродкі, адпушчаныя на іх бягучы і капітальны рамонт, поўнасцю асвоены. Палівам школы таксама забяспечаны на ўвесь зімні перыяд; вучні забяспечаны сшыткамі і інш.

Здавалася-б, што для нармальнай і плённай работы створаны ўсе ўмовы. Аднак, у школах ёсць цэлы рад буйных недахопаў. За першую чвэрць гэтага навучальнага года паспяховасць вучняў школ горада складае толькі 76,4 процанта. Асабліва нізкую паспяховасць паказалі вучні школы № 1. З боку гарадскога аддзела народнай асветы не было ўдзелена неабходнай увагі рабоце педагагічнага калектыва гэтай школы. Сярод асобных настаўнікаў назіраюцца частыя выпадкі спазнення на заняткі і няяўкі ў школу. За першую чвэрць са школы ўшло 46 вучняў. Як ні дзіўна, ніхто з кіраўнікоў горана не пацікавіўся ўстанавіць прычыны адсеву вучняў.

У школах часта зрываецца вывучэнне праграмных матэрыялаў па гісторыі, рускай мове, матэматыцы і іншых прадметах з-за адсутнасці падручнікаў. Метадычны кабінет горана не разгарнуў яшчэ і да апошняга часу сваёй работы.

Соцыялістычнае спаборніцтва ў радзе школ не разгорнута, а калі дзе і праводзіцца, то толькі фармальна і, як правіла, рэзультаты спаборніцтва нікім не правяраюцца. Не ва ўсіх школах выпускаюцца насценныя газеты.

Партыйныя і камсамольскія арганізацыі павінны прыкласці ўсе намаганні для ліквідацыі недахопаў, якія маюць месца ў школах.

П. Паўлаў.

Аб гарадскіх лазнях

(Пісьмо ў рэдакцыю)

У горадзе ёсць дзве лазні з максімальнай прапускной здольнасцю 350—500 чалавек у дзень. Як працуюць гэтыя бытавыя установы горада, кіраўнікі гарадскога выканаўчага камітэта маглі-б пераканацца, наведаўшы іх.

Раён, які прылягае да вакзала, мае насельніцтва каля 50 тысяч чалавек, а ён абслугоўваецца адной лазняй, якая належыць упраўленню чыгункі. Максімальная прапускная здольнасць гэтай лазні—160 чалавек. Лаўкі ў лазні паламаныя. Упраўленне чыгункі не зацікаўлена ў паляпшэнні бытавога абслугоўвання насельніцтва. Лазня працуе толькі тры дні ў тыдзень—з 13 да 21 гадзіны, гэта значыць 8 гадзін, а астатні час зачынена.

Трэба, нарэшце, горвыканкаму вырашыць пытанне аб наладжванні абслугоўвання лазнямі насельніцтва горада.

І. Цімкін.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

28 лістапада, у 8 гадзін вечара, у Доме партактыва (вул. Талстога, 9) адбудзецца інструкцыйны даклад для дакладчыкаў і бяседчыкаў прадпрыемстваў, устаноў і выбарчых участкаў па тэму: «Жыццё і дзейнасць Сяргея Міронавіча Кірава». Дакладчык — лектар абкома партыі тав. Якімовіч.

Аддзел прапаганды і агітацыі Беластоцкага гаркома КП(б)Б.

Адказны рэдактар Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16-10, эканамічнага аддзела—праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя—14-32.

УБ—109. Тыраж 12.000 экз. Друкарня Беластокдрук.